*Т. М. Пятроўская* (УА «Гомельскі дзяржаўны педагагічны каледж імя Л. С. Выгоцкага»)

# РАЗВІЦЦЁ ЭТНАКУЛЬТУРНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ ДЗЯЦЕЙ ПРАЗ ЛІТАРАТУРУ

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца паняцце этнакультурнай ідэнтычнасці дзяцей і яе сувязі з сучаснай дзіцячай літаратурай. Паколькі паняцце гэтае даволі шырокае, аналізуюцца канкрэтныя сродкі ў літаратурным творы, праз якія дзеці могуць засвоіць тыя ці іншыя маральныя каштоўнасці і нормы, прадпісаныяў дадзенай культурнай супольнасці.

Культурная ідэнтычнасць можа быць вызначана як "адзінства культурнага свету чалавека (сацыяльнай групы) з пэўнай культурнай традыцыяй; культурную сістэму, якая характарызуецца засваеннем і прыняццем каштоўнасцей, нормаў, змястоўнага ядра дадзенай культуры і формаў яе выражэння" [1, с. 25]. Новай тэндэнцыяй у выхаванні этнакультурнай ідэнтычнасці ў сучасных літаратурных творах для дзяцей становіцца выкарыстанне ідэй у кантэксце хрысціянскага вучэння і экалагізацыя сучаснага патрыятычнага выхавання. Што датычыцца першага, то яно фарміруе як канвенцыйныя, маральныя, эталонныя каштоўнасці, так і прыватна рэлігійныя. Так, Казік з казачнай аповесці "Дахавік Казік" У Васьковасвяткуе каталіцкае Раство, наведвае святочную службу. Гераіня казкі "Каляды з хроснай" А. Масла бачыць сапраўднага анёла, таксама святкуе Раство разам са сваёй хроснай.

Другім аспектам фарміравання этнакультурнай ідэнтычнасці, безумоўна, з'яўляецца патрыятычнае выхаванне. Згодна з трактоўкамі гэтага паняцця педагогамі, такое выхаванне ахоплівае як уласна прывіццё любові да сваёй радзімы, пачуцця гонару за яе, так і фарміраванне адказнасці за свае ўчынкі, актыўнай грамадзянскай пазіцыі. У савецкі перыяд сутнасць патрыятызму тлумачылася з улікам сацыяльна-палітычных пачуццяў, а менавіта згодна з камуністычным выхаваннем. У наш час ёсць спробы наблізіць патрыятызм да агульначалавечых каштоўнасцей. Педа-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гог І.Ф. Харламаў вызначае патрыятызм як "узаемазвязаную сукупнасць маральных пачуццяў і рыс паводзін, якія ўключаюць любоў да Радзімы, актыўную працу ў імя яе росквіту, множанне працоўных традыцый народа, беражлівыя адносіны да гістарычных помнікаў і звычаяў роднай краіны, прыхільнасць і любоў да родных мясцін, імкненне да ўмацавання гонару і годнасці Радзімы, гатоўнасць і ўменне абараняць яе, вайсковую адвагу, мужнасць, братэрства і сяброўства народаў, нецярпімасць да расавай і нацыянальнай варожасці, павагу звычаяў і культуры іншых краін і народаў, імкненне да супрацоўніцтва з імі" [2, с. 389]. Для малодшых школьнікаў і дашкольнікаў характэрна канкрэтнае мысленне, таму патрыятычнае выхаванне павінна мець рэальнае ўвасабленне. Радзіма ў такім ўзросце не абстрактнае паняцце, а тое, чым можна захапляцца, ганарыцца і г. д. Менавіта таму якасным сродкам фарміравання патрыятычнага выхавання з'яўляецца далучэнне да прыроднага хараства роднай краіны. Дзеці 6–11-гадовага ўзросту мысляць вобразамі, канкрэтнымі катэгорыямі, эмацыйна ўспрымаюць ярка афарбаваныя падзеі і факты. У сучасных дзіцячых казках патрыятычнае выхаванне здзяйсняецца праз наступныя сюжэты.

1. Падарожжа па родных мясцінах, захапленне хараством прыродных багаццяў. Напрыклад, твор А. Карлюкевіча "Прыгоды Максімкі на Бацькаўшчыне і ў розных краінах свету" выхоўвае як пачуццё гонару за радзіму, так і інтэрнацыяналізм, талерантнасць. Яго герой вандруе па самых розных мясцінах як Беларусі, так і ўсяго свету. У канцы кожнай часткі даецца дадатковая інфармацыя пра кожную краіну. Такім чынам, дадзеная кніга носіць і пазнавальны характар. Гэтым адрозніваюцца і іншыя патрыятычныя казкі А. Карлюкевіча. У творы "Святланка піша сачыненне" чытач разам з галоўнай гераіняй даведваецца пра Туркменістан, аднак пазнавальнае тут адыходзіць на другі план. Цэнтральным становіцца благі ўчынак брата Святланкі, які па-злому жартуе з яе.

2. Вяртанне на радзіму пасля чаргі прыгод. Так, героі твора В. Гапеева "Сонечная паляна" шукаюць сабе новую паляну, але ў выніку вяртаюцца на старую, родную. Твор выхоўвае пачуццё адказнасці за свой родны дом: ніхто, акрамя саміх насельнікаў паляны, не можа дапамагчы ёй справіцца з патопам. Тое, што менавіта родная паляна становіцца сонечнай, падкрэслівае галоўную характарыстыку Радзімы: утульнасць, гасціннасць. Гераіня казачнай аповесці А. Масла "Як пані Чаротная ў госці ў Палангу бегала" жабка пані Чаротная вымушана ісці ў падарожжа на Балтыйскае мора. Радзіма мае канкрэтнае ўвасабленне ў выглядзе раслін, жывёл, краявідаў, помнікаў, якія ўласцівы Беларусі. Творы заклікаюць яшчэ і да захавання прыродных багаццяў, тым самым набываючы і экалагічнае значэнне.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Як бачна, экалагічная тэма ў казках мяжуе з патрыятычнай. Невыпадкова, што зусім нядаўна з'явіўся новы тэрмін "этнаэкалагічная адукацыя", які ўпершыню прагучаў у 2004 годзе на канферэнцыі ЮНЭСКА. Этнаэкалагічнае выхаванне гарманічна аб'ядноўвае ў сабе два складнікі маральнага выхавання – экалагічны і этнічны. Пад першым разумеецца адзінства экалагічнай свядомасці і паводзін, гарманічных з прыродай. Этнічнае выхаванне – гэта мэтанакіраванае далучэнне да маральных каштоўнасцей, фарміраванне мадэлі паводзін свайго этнасу і азнаямленне з элементамі яго культуры. Такім чынам, змест этнаэкалагічнага выхавання заўсёды звязаны з менталітэтам насельнікаў краіны. Гісторыя паказвае, што педагагічныя ідэі і канцэпцыі, якія ўлічваюць менталітэт, заўсёды больш арганічна ўпісваюцца ў педагагічную практыку, таму што адлюстроўваюць ідэальны вобраз чалавека – прадстаўніка канкрэтнага народа. Фактычна ў малодшым школьным узросце патрыятычнае выхаванне і звязваецца з прыроднымі асаблівасцямі краіны. Кнігі Л. Рублеўскай "Карона на дне віра, альбо Казкі з хутара Юстына" і Р. Баравіковай "Казкі з гербарыя" якраз напісаны ў этнаэкалагічным кірунку. Абедзве кнігі апавядаюць у казачнай форме пра гісторыю паходжання тых ці іншых раслін, унесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Зразумела, што гэтыя гісторыі ніякай сувязі з рэальным паходжаннем раслін не маюць, аднак робяць іх уласцівасці больш запамінальнымі і актуальнымі для дзяцей. У кожнай кнізе ўсе казкі аб'яднаны адным персанажам, які іх і распавядае. У канцы казак героі ператвараюцца ў расліны з-за немагчымасці захоўвацца ў чалавечым абліччы. У аснове твораў Р. Баравіковай, і Л. Рублеўскай ляжыць канцэпт "карыснасці" ўсіх раслін, нават калі яны атрутныя. Толькі чалавек сам вырашае, як ён будзе іх выкарыстоўваць – на карысць здароўю ці не. Такім чынам падкрэсліваецца сувязь паміж чалавекам і прыродай, прычым прыродны свет, куды трапляюць героі пасля несправядлівых адносін да іх, аказваецца больш спагадлівым, гарманічным. У адзначаных кнігах галоўныя станоўчыя героі не абстрактныя, гэта беларусы, часцей за ўсё сяляне, якія адрозніваюцца годнымі, справядлівымі, смелымі і прыгожымі ўчынкамі.

У наш час, калі кніга як носьбіт маральных каштоўнасцей вельмі цяжка вытрымлівае канкурэнцыю з сучаснымі сродкамі інфармацыі, трэба быць яшчэ больш патрабавальнымі да зместу пазакласнага чытання для малодшых школьнікаў. У гэтым плане кніга на беларускай мове абавязкова павінна адлюстроўваць каштоўнасці нашага народа, але і адначасова быць актуальнай і займальнай для маленькага чытача.

## Літаратура


1. *Малыгина, И. В.* Этнокультурная идентичность: Онтология, морфология, динамика : дис. ... д-ра филос. наук : 24.00.01 / И. В. Малыгина. – Москва, 2005. – 305 с.
2. *Харламов, И. Ф.* Педагогика: краткий курс : учебное пособие для студентов вузов педагогических специальностей / И. Ф. Харламов. – Минск : Вышэйшая школа, 2004. – 272 с.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова